# З гісторыі палаца ў Жалудку



2024 г.

# Палац



Задуменна паглядае на свет сваімі вачамі-вокнамі некалі шыкоўны палац князёў Святаполк-Чацвярцінскіх у Жалудку. У яго свая гісторыя, свая біяграфія, і, паверце, вельмі цікавая.

Незадоўга да Першай сусветнай вайны, на працягу 1907 – 1908 гадоў, князі Святаполк-Чацвярцінскія пабудавалі новы двухпавярховы палац у стылі неабарока. (Дарэчы, па меркаванні суседзяў князёў – ў старафранцузскім стылі). Лічыцца, што аўтарам праекта з'яўляецца вядомы варшаўскі архітэктар Уладзіслаў Марконі. Сучаснікі сцвярджалі, што першасны праект распрацаваў віленскі інжынер-архітэктар Тадэвуш Раствароўскі, а Марконі толькі ўнёс пэўныя карэктывы. Так ці інакш, але палац атрымаўся на зайздрасць многім і зрабіў бы гонар не толькі правінцыі, але і Кракаву, і Варшаве. Анатоль Кулагін, знаўца архітэктуры, пісаў: “«Двухпавярховы будынак, на франтальных фасадах раскрапаваны (падзелены) глыбокімі прамавугольнымі бакавымі і авальным цэнтральным рызалітамі з аўтаномнымі фігурнымі шатровымі завяршэннямі на фоне пластычнага мансардавага даху. Галоўны ўваход выдзелены балконам на чатырох парных калонах, з боку дваровага фасада яму адпавядаў высокі шкляны вітраж параднай лесвіцы. Паміж рызалітамі дваровага фасада працягнута балюстрадная тэраса, на якую выходзілі парадныя памяшканні першага паверха. Да буйных архітэктурных форм дададзены лёгкія элементы ракако… ».



Мірон Мардуховіч успамінае аб тым, якім бачылі палац мясцовыя жыхары ў сярэдзіне 1930-х гг.: “ Адмысловае месца ў жыцці мястэчка займаў маёнтак графа Чацвярцінскага. Ён размяшчаўся за кіламетр ад горада, туды вяла дарога, абсаджаная векавымі дрэвамі, перад маёнткам яна ператваралася ў цяністую алею, у канцы якой стаялі масіўныя вароты. Далей шляху не было. Праз краты варот можна было бачыць пышны траўнік з

кветнікам, цёмна-зялёныя дэкаратыўныя дрэвы, а ў глыбіні двара стаяў двухпавярховы будынак палаца мудрагелістай архітэктуры з чырвоным чарапічным дахам і высокім імпазантным ганкам. *За варотамі ішло ціхае і* таямнічае жыццё графскага сямейства, і местачковыя хлапчукі хутчэй са здзіўленнем, чым з зайздрасцю, глядзелі на прыбраных панічоў, якія гулялі на лузе перад палацам".

За палацам размяшчаўся выдатны парк, а за ім сажалка, у цэнтры якой мелася таямнічая зялёная выспа з альтанкай. За сажалкай стаяў «фальварак», дзе месціліся хаты шматлікай прыслугі, свіраны, стайні, склады. Каля плаціны з аднаго боку стаяў вадзяны млын, а з другога невялікі спіртзавод. Абодва будынкі былі пабудаваны з чырвонай цэглы і бутавага каменю.

У час Першай сусветнай вайны нямецкія тылавікі, якія любілі фатаграфаваць хаты бедных беларускіх сялян, былі моцна здзіўлены шыкоўным палацам і таксама фатаграфаваліся на яго фоне. Маёмасць была разрабавана, зніклі каштоўныя мастацкія калекцыі. Палац выратавала тое, што яго занялі пад ваенны шпіталь.

Пасля вайны ў палацы не жылі, таму што зімой 1918г. палопаліся трубы цэнтральнага ацяплення і не былі адрамантаваны. У цёплы час у ім праводзілі прыёмы і балі. А яшчэ на лета прыязджала моладзь.




З часам становішча выправілася. Аб багацці княжацкай сям'і сведчаць успаміны іх суседа з Ішчалны Караля Лясковіча, які быў удзельнікам балю ў гонар афіцэрскага корпусу 2-га палка Грохаўскіх уланаў, у якім служылі маладыя князі.

Гасцей было каля 70 чалавек. Частаванне прайшло ў вялікай зале. Ежа была вытанчанага смаку. Здзіўлялі сталовыя прыборы. Сервізы былі з парцэляны вышэйшага гатунку (фарфор) і ўсе былі аздоблены падвойнымі гербамі Радзівілаў і Чацвярцінскіх. На залатых покрыўках значыліся пробы каштоўнага метала. Для кожнага госця быў пакладзены поўны камплект патрэбных прыбораў. Расказчык выкарыстаў не ўсе, таму што нават не ведаў іх прызначэння.

Вада ў палац паступала з крыніц за 2 км ад палаца самацёкам. На месцы яна фільтравалася і паднімалася ў рэзервуар на 3-м паверсе будынка з дапамогай помпаў, якія працавалі на сціснутым паветры.

Хочацца дадаць, што Людвік Чацвярцінскі валодаў адным з чатырох у Шчучынскім павеце аўтамабіляў і тэніснай пляцоўкай.

Нягледзечы на багацце, Чацвярцінскія вялі аскетычнае штодзённае жыццё.

Прыемна здзіўляюць добрыя адносіны князёў да простых людзей. Пры двары жыў лекар, які абслугоўваў усіх работнікаў маёнтка і працаваў у шпіталі Святой Разаліі ў мястэчку, які фундавала княгіня Ружа. Княгіня за свае грошы ўтрымлівала ткацкія майстэрні. Дзіцячы садок гадаваў дзяцей работнікаў.  Усталявалася традыцыя, што на ўсе грамадскія акцыі адзін Жалудок даваў столькі ж грошай, колькі ўсе астатнія землеўладальнікі павета.

Пагарэльцам выдаваліся грашовая дапамога і бясплатна дрэва на пабудову. Чацвярцінскія паважалі працавітых людзей, а хуліганаў і п'яніц нават маглі выселіць з мястэчка на хутары. У 1937г. была пабудавана невялікая электрастанцыя, пачалі праводзіць электрычнасць па хатах (самых заможных). А калі на вуліцах успыхнулі электрычныя ліхтары, усё насельніцтва да позняй ночы любавалася нябачаным відовішчам. Яшчэ ў 1902г. маёнткі Жалудок і Ліпічна злучыла тэлефонная сувязь.

Лёс гаспадара шыкоўнага палаца, на жаль, скончыўся трагічна. У верасні 1939г. Чацвярцінскія паехалі чыгункай у Вільню. У Лідзе на станцыі князь быў апазнаны і разам з жонкай арыштаваны. У мясцовай турме яны прабылі 7 месяцаў. Па просьбе італьянскага караля Віторыё-Эмануіла III Чацвярцінскія былі вызвалены і адпраўлены на тэрыторыю Польшчы. З-за дыверсійнай акцыі ў ваколіцах маёнтка, немцы арыштавалі князя як заложніка і вывезлі ў лагер Асвенцым, дзе ён і загінуў у 1941г.

Падчас нямецкай акупацыі ў сядзібе Чацвярцінскіх размясціўся шпіталь, што ізноў выратавала палац ад знішчэння.

Пасля вайны да 1983г. тут змяшчаліся войскі супрацьпаветранай абароны. З пачатку 1990г. палацава-паркавым комплексам валодае навуковае прадпрыемства “Конус”.

**(Далей скапіравана з “pavet/net”** Палац у Жалудку**)**

Тут былі зняты першы беларускі фільм жахаў «Масакра» (2010 г., рэжысёр Андрэй Кудзіненка), а таксама фільмы «Дом» (2011 г., рэжысёр Арцём Лобач) і «Кіндэр-Вілейскі прывід» (2014 г., рэжысёр Алена Турава).

Вядома, што пачынаючы з 1990-х гг. сваю дапамогу ў рэстаўрацыі сядзібы прапаноўвала старэйшая дачка Станіслава Святаполк-Чацвярцінскага Ізабэла Дзюбуа Дэш (унучка Людвіка Чацвярцінскага і Ружы Радзівіл), якая нарадзілася ў 1934 г. у Варшаве і з 1958 г. жыла ў Бруселі. Частку сродкаў мог вылучыць Еўрапейскі Саюз, але пры ўмове, што 30% усіх выдаткаў возьме на сябе Беларусь. Аднак гэты праект не быў ажыццёўлены.

Нягледзячы на гэта, княгіня рэгулярна аказвала дабрачынную дапамогу мясцовым касцёлу і шпіталю. Таму на Жалудоцкай пасялковай бальніцы размясцілі памятную дошку з ўдзячнасцю да спадарыні Ізабэлы Дзюбуа Дэш за яе гуманізм і дабрачыннасць.

У 2014 г., пасля некалькіх няўдалых спроб, сядзіба Чацвярцінскіх праз аўкцыён была прададзена за суму, эквівалентную 90 000 долараў. Пакупнікамі сталі расійскія прадпрымальнікі Соф'я Гаўрылава і Васіль Лебедзеў, якія мелі турыстычную фірму ў Маскве і гатэль у Рызе. Гэтая сямейная пара жадала стварыць тут вялікі турыстычны комплекс. Але ўладальнікі не выканалі дамовы, і ў 2020 г., яны, магчыма, страцілі права на гістарычную сядзібу.

Выкарыстаныя крыніцы

Архітэктура Беларусі. т.3 кн.2

Жалудок. Гісторыя нашага краю. Гродна “ЮрСаПрынт” 2020

Крыніца: *Лаўрэш Леанід. Палац у Жалудку // Наша Слова № 28 (1543), 15 ліпеня 2021 г.; № 29 (1544), 22 ліпеня 2021.; Лаўрэш Леанід. Жалудок і палац Чацвярцінскіх // Лідскі Летапісец. 2022. № 1-2(97-99). С. 32-38*

Мирон Мордухович. Местечко Желудок // Желудок: память о еврейском местечке. С. 267-302. Центр научных работников и преподавателей иудаики в ВУЗах «Сэфер» Институт славяноведения Российской академии наук. Москва 2013

